А.К.КІКЛЕВІЧ

СІСТЭМА ЗАЙМЕННІКАЎ З ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СЕМАНТЫЧНАГА ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ (у пошуках рацыянальнай граматыкі)

У шэрагу папярэдніх публікацый і навуковых дакладаў[1] намі крытычна разглядалася тлумачэнне прыналежных займеннікаў як форм маніфестацыі катэгорыі пасесіўнасці (прыналежнасці). Гэта тлумачэнне, распаўсюджанае не толькі ў тэарэтычных і практычных граматыках, але і ў спецыяльных манаграфіях[2], не пацвярджаецца назіраннямі над моўнымі фактамі. Пар.: (1) *Шчабечуць песню сваю мітуслівыя ластаўкі* (Я.Брыль). (2) *Толькі на другі дзень убачыў Кандрат Назарэўскі свой родны гарадок* (К.Чорны).

У першым сказе не можа быць гаворкі аб тым, што песня належыць ластаўкам, у другім сказе выраз *свой гарадок* нельга тлумачыць як 'гарадок, які належыў яму, г.зн. Кандрату'. Назоўнік у канструкцыях тыпу S–Pron$_{poses}$ уступае ў розныя прэдыкатыўныя адносіны, напрыклад: *сваю песню* азначае 'песню, якую яны спявалі', а *свой гарадок* – 'гарадок, у якім ён жыў раней'. У процілегласці да граматычных даследаванняў, тлумачальныя слоўнікі адлюстроўваюць семантычны плюралізм у сферы рэалізацыі прыналежных займеннікаў. Пры гэтым пасесіўнасць выступае як адна з радавых семантычных прымет у намінатыўнай структуры займенніка. Так, у "Тлумачальным слоўніку беларускай мовы" адрозніваецца больш дзесяці значэнняў лексемы *свой*:

1. 'Які належыць сабе, уласцівы сабе, які мае адносіны да сябе'.
2. 'Які выконваецца, робіцца, здабываецца і пад. самім, самастойна, без чыёй-небудзь дапамогі'.
3. 'Уласцівы толькі дадзенай асобе або прадмету'.
4. 'Прызначаны для каго-небудзь, чаго-небудзь, адпаведны, належны'.
5. 'Які знаходзіцца ў сваяцкіх, сяброўскіх або іншых блізкіх адносінах, звязаны месцам жыхарства, сумеснай працай, агульнымі інтарэсамі і пад.' і інш.

Тлумачальныя слоўнікі маюць, аднак, іншы недахоп: зусім беспадстаўна яны кваліфікуюць займеннікавую лексему як носьбіта аднаго з прэдыкатыўных значэнняў. Але, напрыклад, у выказванні (1) прэдыкатыўнае значэнне 'спяваць', якое змяшчае канструкцыя *свае песні*, абумоўлена не займеннікам, а назоўнікам, у семантычную структуру якога гэта значэнне ўваходзіць на правах аднаго з кампанентаў (пар. слоўнікавае тлумачэнне: *песня* = 'невялікі паэтычны твор для спеваў'). У выказванні (2) канструкцыя з займеннікам *свой гарадок* змяшчае прэдыкатыўнае значэнне 'жыць', якое таксама з'яўляецца часткай семантычнай структуры назоўніка. Роля займенніка заключаецца толькі ў тым, каб характарызаваць дэнататыўны статус аднаго з аргументаў пры гэтым прэдыкаце, а менавіта – характарызаваць яго праз ідэнтыфікацыю з рэферэнтам дзейніка (прадмета паведамлення).

Функцыянальна-семантычны аналіз так званых "прыналежных" займеннікаў паказаў, што іх карэляцыя з катэгорыяй пасесіўнасці з'яўляецца навуковым фантомам (па іншых даных, доля канструкцый з "прыналежнымі" займеннікамі, якія выражаюць семантыку прыналежнасці, не перавышае 5%), а значыць, аўтаномнага лексіка-семантычнага класа "прыналежных" займеннікаў аб'ектыўна ў моўнай сістэме няма.

У гэтым артыкуле мы паспрабуем адказаць на пытанне, чым з'яўляюцца так званыя "прыналежныя" займеннікі, якое месца яны займаюць у агульнай сістэме займеннікаў і якую структуру мае гэта сістэма.

Семантычны сінтаксіс адрозніваe тыпы прэдыкатаў у залежнасці ад п а р а д к у. Прэдыкаты першага парадку маюць прадметныя аргументы, а

прэдыкаты другога (або высокага) парадку патрабуюць, каб хаця адзін з іх аргументаў быў прэдыкатным, г.зн. супадаў з цэлай прапазіцыяй. Напрыклад: (3) *Прыезд брата здзівіў нас.*

Выказванне (3) можна ўявіць у выглядзе трансфармацыі 'Тое (той факт), што прыехаў брат, здзівіла нас' альбо формулы на мове логікі прэдыкатаў:

ЗДЗІВІЦЬ ((ПРЫЕХАЦЬ(x), у) (1)
БРАТ(x, у)
МЫ(у)

Формула азначае: 'Тое, што прыехаў прадмет *x*, такі, які з'яўляецца братам у адносінах да прадмета *у*, які ёсць мы, здзівіла прадмет *у*'. Прэдыкат ПРЫЕХАЦЬ – першага парадку, бо мае толькі прадметныя аргументы *x* і *у*, а прэдыкат ЗДЗІВІЦЬ – другога парадку, бо яго першы аргумент уяўляе сабой цэлую прапазіцыю: ПРЫЕХАЦЬ (*x, у*).

Падзел прэдыкатаў на асобныя разрады ў залежнасці ад парадку дазваляе ўдакладніць іх катэгарыяльныя семантычныя ўласцівасці. Так, агульнай рысай мадальных і фазавых аператараў (*магчыма, абавязкова, пачаць, скончыць* і інш.) з'яўляецца тое, што яны заўсёды функцыяніруюць як прэдыкаты высокага парадку. Разгледзім выказванне (4): (4) *Немагчыма, каб прыезд брата здзівіў нас.*

Гэта выказванне можна фармалізаваць:

НЕМАГЧЫМА (ЗДЗІВІЦЬ ((ПРЫЕХАЦЬ (x), у)) (2)
БРАТ (x, у)
МЫ (у)

Формула азначае: 'З'яўляецца немагчымым той факт, што тое, што прыехаў прадмет *x*, які з'яўляецца братам у адносінах да прадмета *у*, які ёсць мы, здзівіла прадмет *у*'. Усё (складанае па свайму прапазіцыйнаму зместу) выказванне *Прыезд брата здзівіў нас* выступае аргументам пры аднамесным прэдыкаце высокага парадку НЕМАГЧЫМА.

Парадак як істотная характарыстыка сінтаксічнай функцыі кампанента сказа разглядаецца толькі прымяняльна да прэдыкатаў, на іншыя ж кампаненты (аргументы і аператары) ён звычайна не распаўсюджваецца. Аднак падобная экстрапаляцыя прынцыпова магчымая, больш таго, у дачыненні да некаторых класаў слоў (у прыватнасці, да займеннікаў) яна дазваляе атрымаць прынцыпова новыя вынікі.

Разгледзім выказванні: (5) *Гэты прыезд брата здзівіў нас*; (6) *Яго прыезд здзівіў нас.* Выказванне (5) можа быць фармалізавана:

ЗДЗІВІЦЬ ((ПРЫЕХАЦЬ (x) у)) (3)
БРАТ (x, у)
МЫ (у)
ГЭТЫ (ПРЫЕХАЦЬ (x))

Дадзены выраз адрозніваецца з семантычнага пункту гледжання ад выказвання (3) толькі азначальнасцю першага аргумента пры ядзерным (або ўключаючым) прэдыкаце ЗДЗІВІЦЬ – пры дапамозе займенніка *гэты* гаворачы дадаткова паведамляе аб тым, што рэферэнт аргумента яму вядомы – гэта канкрэтная падзея, аб якой ён альбо чуў, альбо быў яе сведкам.

Іншую функцыю выконвае так званы "прыналежны" займеннік *яго* ў сказе (6), пар. трансфармацыю:

ЗДЗІВІЦЬ ((ПРЫЕХАЦЬ (x) (у) (4)
ЁН (x) МЫ (у)

Займеннік *яго*, у адрозненне ад указальнага займенніка *гэты*, зазначае дэнататыўны статус аргумента не кіруючай, а ўключанай (залежнай) прапазіцыі ПРЫЕХАЦЬ (x), інакш кажучы, паказвае, што аргумент гэтай прапазіцыі супадае з асобай, пра якую ўжо вялася гаворка, або якая прысутнічае ў камунікатыўнай сітуацыі.

Гэта розніца паміж указальнымі і "прыналежнымі" займеннікамі праяўляецца ў наступных перыфразах: (7) **Яго прыезд брата здзівіў нас*; (8) *Гэты яго прыезд здзівіў нас*.

Выказванне (7) не карэктнае, бо дзве словаформы – займеннік *яго* і назоўнік *брата* – прэтэндуюць на адну і тую ж семантычную функцыю аргумента (менавіта – суб'екта) пры ўключаным прэдыкаце ПРЫЕХАЦЬ. Указальны займеннік *гэты* адносіцца да аргумента пры іншым, уключаючым прэдыкаце – ЗДЗІВІЦЬ, таму дапаўняльная дыстрыбуцыя займеннікаў *гэты* і *яго* ў выказванні (8) не выклікае супярэчнасці з моўнай нормай. Параўнайце логіка-сімвалічнае адлюстраванне гэтага выказвання:

ЗДЗІВІЦЬ ((ПРЫЕХАЦЬ (x), y)) (5)
ЁН (x) МЫ (y)
ГЭТЫ (ПРЫЕХАЦЬ (x))

Далейшыя назіранні паказваюць, што вылучаныя намі семантычныя асаблівасці ўказальных і "прыналежных" займеннікаў маюць не выпадковы, аказіянальны, а агульны характар. Усім так званым "прыналежным" займеннікам уласціва тое, што яны выступаюць як аператары дэнататыўнага статуса ўключанай (залежнай) прапазіцыі. Будзем называць займеннікі гэтага тыпу аператарамі нізкага парадку. Паглядзім, як гэта функцыя рэалізуецца ў выказванні (9): (9) *Ты ўспомніш мае словы*. Гэтаму выразу адпавядае сімвалічная трансфармацыя:

УСПОМНІЦЬ (x, y) (6)
ТЫ (x) СЛОВЫ (y)
СКАЗАЦЬ (z, y,)
Я (z)

Формула (6) азначае: 'Прадмет, які ёсць ты, успомніць прадмет, які з'яўляецца словамі, такімі, якія сказаў прадмет, які ёсць я'. "Прыналежны" займеннік *мае* выражае рэферэнцыяльную характарыстыку суб'екта залежнай прапазіцыі СКАЗАЦЬ (z, y), а менавіта – інфармуе аб тым, што гэты суб'ект супадае з гаворачым.

Указальныя займеннікі, наадварот, заўсёды выступаюць як аператары высокага парадку – яны актуалізуюць дэнататыўнае значэнне аргументаў уключаючай прапазіцыі. Напрыклад, у сказе (5) указальны займеннік канкрэтызуе значэнне прэдыкатнага аргумента ПРЫЕХАЦЬ (x), які ўваходзіць у прапазіцыю з прэдыкатам высокага парадку ЗДЗІВІЦЬ. У выказванні (10) указальны займеннік выконвае сваю функцыю адносна аргумента пры прэдыкаце першага парадку: (10) Гэты чалавек мне знаёмы. Сімвалічна:

ЗНАЁМЫ (x, y) (7)
ЧАЛАВЕК (x) Я (y)
ГЭТЫ (x)

У сістэме займеннікаў маецца таксама трэці клас лексічных адзінак, якія ў аспекце парадку не маркіраваны. Будзем называць іх аператарамі рознага парадку. Гэта, напрыклад, асабовыя займеннікі *я, ты, ён, яна, яно, мы, вы, яны*. У выказванні (10) асабовы займеннік *мне* паводзіць сябе падобна ўказальнаму – зазначае, што другі аргумент пры прэдыкаце пер-

шага парадку ЗНАЁМЫ супадае з гаворачым: Я (у). У выказванні (11) асабовы займеннік па сваёй семантыка-сінтаксічнай функцыі можа быць кваліфікаваны як аператар нізкага парадку: (11) *Мая размова з Іванам была цяжкай.*

У гэтым выказванні, якое можна трансфармаваць у выглядзе 'Тое, як я размаўляў з прадметам, які з'яўляецца Іванам, было для мяне цяжкім', асабовы займеннік характарызуе адзін з аргументаў уключанай прапазіцыі РАЗМАЎЛЯЦЬ (х, у), пар. формулу:

ЦЯЖКІ (РАЗМАЎЛЯЦЬ (х, у), х) (8)
Я (х) ІВАН (у)

Такім чынам, у сістэме займеннікаў існуюць дзве падставы класіфікацыі: парадак і характар рэферэнцыі. Паводле першай прыметы займеннікі дзеляцца на тры класы: аператары высокага, нізкага і рознага парадку. Паводле характару рэферэнцыі займеннікі падзяляюцца на асабовыя, пытальныя, абагульняючыя і інш. Так, асабовыя займеннікі канкрэтызуюць значэнне аргументаў дзякуючы іх ідэнтыфікацыі з удзельнікамі камунікатыўнага акта; пытальныя займеннікі характарызуюць аргумент як тое, да канкрэтызацыі чаго гаворачы прымушае слухаючага; абагульняючыя займеннікі інфармуюць аб тым, *што* вядомае *гаворачаму* зыходнае мноства прадметаў, абазначанае дадзеным аргументам, удзельнічае ў сітуацыі ў поўным аб'ёме.

Схематычна агульная сістэма займеннікаў можа быць прадстаўлена так:



Парадыгматычная характарыстыка займенніка, такім чынам, уключае дзве прыметы. Напрыклад, займеннік *я* кваліфікуецца як асабовы аператар рознага парадку, *мой* – як асабовы аператар нізкага парадку, *сябе* – як зваротны аператар рознага парадку, *свой* – зваротны аператар нізкага парадку і г.д. Характар рэферэнцыі адлюстроўвае знешнія параметры займеннікавай семантыкі, а парадак – яго *іманентна-моўныя параметры*, *гэта значыць* – спосаб арганізацыі прэдыкатыўна-аргументнай семантыкі ў рамках цэласных прапазіцыйных структур. У такім адзінстве экстра- і інтралінгвістычнага зместу і праяўляецца спецыфіка займеннікаў як своеасаблівых індэксальных знакаў у сістэме натуральных моў.

[1] Гл.: Киклевич А.К. // Славяно-германские языковые параллели. Мн., 1996; Ён жа // Новые исследования в зарубежной лингвистике. Мн., 1996; Ён жа. Почему "притяжательные местоимения" – местоимения и почему они не притяжательные? (Даклад на семінары славістыкі Рурскага універсітэта ў Бохуме. Германія) 1995, снежань; Ён жа. Czy w języku polskim istnieją zaimki dzierżawcze? (Даклад у Інстытуце "Палонікум" Варшаўскага універсітэта. Польшча) 1996, верасень.

[2] Гл.: Pisarkowa K. Funkcje składniowe polskich zaimków odmiennych. Wrocław etc., 1969. S.69; Miodunka W. Funkcje zaimków w grupach nominalnych współczesnej polszczyzny mówionej. Kraków, 1974. S.75.